# Падвокладкай




**Шлях да Брамы Неўміручасці: матэрыялы Рэспубліканскіх навуковых чытанняў, прысвечаных 115-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы, Мінск (3 сакавіка 2011 г.) / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы; уклад. А. А. Манкевіч. — Мінск: Беларуская навука, 2012. — 167 с.**

Гэты зборнік можна лічыць лагічным завяршэннем святкавання 115-годдзя Кандрата Крапівы, што праходзіла ў краіне ў мінулым годзе. Але тым не менш выданне не губляе сваёй актуальнасці. Наадварот, здабывае дадатковую каштоўнасць: тут абагульняюцца набыткі філалагічнай навукі, зробленыя ў галіне вывучэння творчай і навуковай спадчыны пісьменніка. Больш за тое, артыкулы даследчыкаў — мовазнаўцаў і літаратуразнаўцаў — дапаўняюцца успамінамі сваякоў. Менавіта раздзел "Такім ён застаўся ў памяці… Успаміны пра Кандрата Крапіву" надае кнізе цеплыні і ператварае яе са звычайнага зборніка навуковых атрыкулаў у выданне іншага, больш высокага парадку.




**Иностранные подданные в Беларуси (конец XVIII — начало XX в.) / Сост. И. Л. Вернер; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. — Минск: Тип. Макарова и К, 2012. — 528 с.**

З даўніх часоў іншаземцы з рознымі мэтамі, часцей гандлёвымі, наведвалі тэрыторыі сучаснай Беларусі і сяліліся тут. Больш падрабязныя звесткі пра іх дзейнасць, адметнасці жыцця і працы хаваюцца ў глыбінях архіўных сховішчаў. Але ўсё таемнае аднойчы становіцца вядомым. Вось і Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь у гэтым выданні дзеліцца некаторымі сваімі — калі можна так сказаць — таямніцамі. У даведніку ўпершыню прадстаўлены дакументы, якія асвятляюць прававы статус, сацыяльныя і эканамічныя ўмовы жыцця і дзейнасці замежнікаў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у канцы XVIII — пачатку XX стагоддзяў.




**О. Генри. Дары волхвов / О. Генри; пер. с англ. — Москва: Астрель, 2012. — 477 с.**

Не так даўно ў ЗША адзначылі 150-гадовы юбілей з дня нараджэння Уільяма Сідні Портэра, шырока вядомага ў літаратуры пад псеўданімам О. Генры. Яго кароткія апавяданні (памятаеце, у школе мы часта пісалі іх пераказы на ўроках рускай мовы) і сёння выклікаюць непадробны інтарэс у чытачоў. Іх героі — то проста маленькія людзі вялікага Нью-Ёрка, то легкадумныя і вясёлыя пісьменнікі і мастакі, то хлопцы з бандыцкага раёна і іх верныя сяброўкі, то жыхары Дзікага Захаду — каўбоі, ранчары, фермеры. Іх сюжэты заўсёды захапляльныя, развязкі — імклівыя і нечаканыя.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

***Водгукі дасылайце на электронны адрас аўтара: himarina@tut.by***

**Кнігі для агляду прадастаўлены магазінам "Кніжны салон". Тэл.: 385-60-89.**